# КОЛЬКІ КАШТУЕ «ДРОБЯЗЬ»?



### ПАДРОБКІ — З РАСІЙСКІМІ «КАРАНЯМІ»

На стале ў дэманстрацыйным зале ляжаць стосы разнастайных дакументаў, перабітыя VIN-нумары з аўтамабільных рухавікоў. Вока чапляецца за некалькі таўшчэзных каталогаў, дзе надрукаваны падрабязныя фатаграфіі банкнотаў і ўзораў пасведчанняў асобы. Як адзначае намеснік начальніка аддзела крыміналістычных экспертыз Дзмітрый Пашкевіч, тут сабраны фотакалекцыі з краін усяго свету. Імі і карыстаюцца пры высвятленні сапраўднасці дакументаў і купюр.

— Часцей за ўсё мы даследуем на сапраўднасць бланкі арганізацый і грошы. Між іншым, узор любога бланка, які мае права выкарыстання на тэрыторыі Беларусі, тут жа трапляе да нас у спецыяльную базу. Перыядычна нячыстыя на руку людзі імкнуцца падрабіць дакументы, звязаныя з рэгістрацыяй нерухомасці. А аднойчы і ўвогуле падрабілі пасведчанне аб нараджэнні чалавека 1942 года. Што да замежных фальшывак, то абсалютная большасць іх ідзе з Расіі. Гэта датычыцца і тэхнічных пашпартоў на аўтамабілі, і дыпломаў нібыта расійскіх ВНУ. Злачынцы чамусьці думаюць: калі Беларусь — іншая краіна, то і праверкі не будзе. Што да нашай краіны, то падробленыя тут дыпломы не трапляліся. Разам з тым наш біч — падробленыя школьныя даведкі, якія даюць права бясплатнага праезду ў грамадскім транспарце. Фальшыўкі вырабляюць самі дзеці...

Што да «саматужных» замежных грошай, то і іх значная частка трапляе да нас з Расіі. Трыяда звычайная — долары ЗША, еўра і расійскія рублі. Часцей за ўсё падрабляюць купюры наміналам у 100 долараў, а таксама 20 і 50 еўра. Сустракаюцца і так званыя «частковыя падробкі» — калі купюру вартасцю ў 5 долараў ператваралі ў 50. А вось беларускія рублі падрабляюць нячаста.

Што да электронных носьбітаў інфармацыі, то спецыялісты прадэманстравалі цікавы прыбор ізраільскай вытворчасці. Да яго падключаецца, напрыклад, мабільны тэлефон, і пасля пары маніпуляцый на экране ўся інфармацыя з яго капіюецца для расшыфроўкі. Існуючыя сістэмы крыптаграфічнай абароны таксама не становяцца перашкодай.




Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

### ГАЛАСЫ ДВУХ ЛЮДЗЕЙ НЕ СУПАДАЮЦЬ

У старых шпіёнскіх фільмах неаднаразова дэманстравалі работу фанаскапічнай лабараторыі. Гэта было вялікае памяшканне, аснашчанае разнастайнай габарытнай тэхнікай. Але цяпер усё зводзіцца да звычайнага пульта гукарэжысёра і персанальнага камп'ютара.

Падраздзяленне стваралася 15 гадоў таму для барацьбы з тэлефонным тэрарызмам, — гаворыць галоўны эксперт аддзела тэхнічных экспертыз Максім Саўко. — Цяпер гэтую праблему амаль ліквідавалі. Але з'явіліся іншыя пытанні. Нашым аб'ектам можа стаць любы гуказапіс. Мы здольныя ідэнтыфікаваць асобу па яе голасе, выявіць прыкметы мантажу, адказаць на шэраг пытанняў датычна асобасных характарыстык. Можна высветліць прыкладны ўзрост чалавека, яго стан. Шанц супадзення голасу ў двух чалавек меншы за верагоднасць супадзення двух адбіткаў пальцаў.

### ЯК ПРАЦУЕ ЭЛЕКТРАНОС?

Калі ўваходзіш у пажарна-тэхнічную лабараторыю, адразу ў вочы кідаецца моцна абгарэлы халадзільнік. Ад электрапрыбора засталіся фактычна адны металічныя сценкі. А за халадзільнікам на стале ляжыць мноства пакункаў. Там складзены парэшткі таго, што было на кухні падчас пажару — электрачайнік, тостар, фрагмент разеткі...

— Здаецца, што агонь усё знішчыў, — гаворыць галоўны эксперт аддзела спецыяльных экспертыз упраўлення спецыяльных і тэхнічных экспертыз Аляксандр Балобан. Але для эксперта ёсць над чым папрацаваць. Мы аналізуем ацалелыя канструкцыі, ступень уздзеяння на кожную сценку халадзільніка. Вось тут маразільная камера пашкоджана слаба. Ачаг агню, значыць, знаходзіўся не ў гэтай зоне. Кампрэсар цэлы, слядоў тэрмічнага ўздзеяння на яго няма. Значыць, прычына не ў яго няспраўнасці.

У арсенале пажарна-тэхнічных экспертаў ёсць цікавыя прыборы. З дапамогай газааналізатара, які неафіцыйна называецца «электраносам», можна адказаць на пытанне, адбыўся пажар з-за падпалу ці не. Уражвае спецыяльная штанга «Ультратэрм» даўжынёй больш за тры метры. Праўда, выкарыстоўваюць яе толькі тады, калі трэба знайсці месца першапачатковага ўзгарання ў кватэры, у якой выгарала ўсё да бетонных сцен. А такія пажары ў Мінску здараюцца не кожны год. Тут экспертам на дапамогу прыходзяць законы фізікі: канвектыўныя плыні ад агню заўжды накіраваны ўверх. Адпаведна, і максімальнае разбурэнне перакрыццяў і столі будзе ў зоне над ачагом.

### МАХЛЯРСТВУ — СТОП

У шматлікіх дэтэктыўных фільмах нярэдка паказваюць, як працуе следчая група на месцы здарэння. Вонкава здаецца, што адрозненняў як быццам і няма. Але калі паназіраць за работай больш уважліва, то становіцца зразумела: за 10-15 хвілін канчатковае заключэнне эксперт даць не можа, бо ён мусіць вывучыць кожны, нават самы маленькі пакінуты след. Часта на гэта сыходзіць некалькі гадзін.

— Падчас чэмпіянату свету па хакеі звярнуліся ў міліцыю іншаземцы, якія заявілі, што ў іх укралі машыну, — расказвае начальнік Маскоўскага (г. Мінска) раённага аддзела Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Дзяніс Кузьменка. — Аўтамабіль пасля знайшлі ў лесе спаленым. Завялі крымінальную справу, а пасля высветлілася, што... самі ж уладальнікі загналі аўтамабіль у лес і падпалілі яго, каб пасля атрымаць страхоўку. І вось дзякуючы нам махлярскую схему раскрылі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Весткі з Кітая

## ДАЛЯГЛЯДЫ ШАЎКОВАГА ШЛЯХУ

**Сёння ў Пекіне праходзіць прадстаўнічы форум супрацоўніцтва СМІ «Адзін пояс, адзін шлях», які арганізавала газета «Жэньмінь жыбаа».**

На яго сабраліся прадстаўнікі вядучых масмедыя з розных куткоў свету. Тэмай абмеркавання сталі перспектывы развіцця, пэўна, найбуйнейшага транснацыянальнага праекта сучаснасці — Вялікага шаўковага шляху. Перад прысутнымі выступілі кіраўнікі вядучых прамысловых прадпрыемстваў, карпарацый Паднябеснай, шэрагу рэгіёнаў. На думку экспертаў, варта ўлічваць выклікі сучаснасці, каб найбольш эфектыўна прасоўваць эфектыўную і карысную для ўсіх бакоў інтэграцыю ў межах Вялікага шаўковага.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** *litvinov@zviazda.by*

■ Мы ў свеце

## «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» ПАКАЗАЛІ Ў ЕЎРОПЕ

Праграма пра фестываль выйшла на канале Euronews

**Карэспандэнт гэтага тэлеканала Себасцьян Саам падрыхтаваў тэматычную 4-хвілінную перадачу пра «Славянскі базар у Віцебску». «Гэта падобна да «Еўрабачання», толькі інтэрнацыянальнай мовай тут стала не англійская, а руская, — перадае журналіст. — І тут не толькі для Аўстраліі ёсць месца ў конкурсе, а для любой краіны, незалежна ад яе кантынентальнай прыналежнасці. Гэта «Славянскі базар», дзе рады ўсім і заўсёды».**

Як праходзіў любімы беларусамі фестываль мастацтваў, еўрапейскія гледачы маглі пабачыць у тэлеэфіры на мінулым тыдні. Паглядзець відэаролік можна і зараз: ён размешчаны на сайце канала ў раздзеле пра культуру. Здымка сюжэта пра асноўныя падзеі культурнага форуму была арганізавана па ініцыятыве і пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Беларусі.

За 25 гадоў існавання фестываль стаў знакавай падзеяй не толькі для культурнага жыцця нашай дзяржавы, але і многіх іншых краін блізкага і далёкага замежжа. Сёлета форум сабраў прадстаўнікоў 45 краін. Ён заслужана прыцягвае павышаную ўвагу сродкаў масавай інфармацыі. Для асвятлення мерапрыемства было акрэдытавана больш за 100 замежных журналістаў з 10 краін.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■ Ведай нашых!

## З УЗНАГАРОДАЙ!




**Старшыня Мінаблвыканкама Сямён ШАПІРА** уручыў узнагароды журналістам рэспубліканскіх і рэгіянальных выданняў па выніках штогадовага абласнога спаборніцтва сярод сродкаў масавай інфармацыі. Дыплом за лепшы творчы праект атрымала **спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда» Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Прыёмная кампанія — 2016

# Мужчынскае аблічча педагогікі

## ...усё больш юнакоў выбіраюць настаўніцкі шлях

**Як паказала апытанне, праведзенае у сацыяльнай сетцы "УКантакце" сярод абітурыентаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, большасць з іх выбралі педагагічную прафесію свядома.**

«Што паўплывала на ваша рашэнне паступіць у вядучы педагагічны ўніверсітэт краіны — БДПУ?» — так гучала пытанне. Каля 40% учарашніх школьнікаў адказалі, што з дзяцінства марылі стаць педагогамі. Каля 12% зрабілі свой выбар па рэкамендацыі бацькоў. Больш як 10% абітурыентаў вырашылі працягнуць педагагічную дынастыю і яшчэ такой жа колькасці выпускнікоў выбар дапамог зрабіць іх школьны настаўнік.

Як адзначаюць у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, вынікі ўступнай кампаніі гэтага года радуюць. Усяго сюды было пададзена амаль 2600 заяў, конкурс сфарміраваўся на ўсіх спецыяльнасцях бюджэтнай формы навучання (дзённай і завочнай) у сярэднім 2 чалавекі на месца. У выніку БДПУ на 100% выканаў план прыёму на бюджэтныя месцы, прычым зроблена гэта было без абвяшчэння дадатковага набору.

Самыя высокія конкурсы на дзённую бюджэтную форму навучання склаліся на спецыяльнасцях «Спартыўна-турысцкая дзейнасць (менеджмент у турызме)»— 12,6 чалавека на месца, «Спартыўна-педагагічная дзейнасць (спартыўная рэжысура)» — 7,8 чалавека на месца, «Псіхалогія» — 6,9 чалавека на месца, «Практычная псіхалогія» — 2,8 чалавека на месца, «Фізічная культура. Фізкультурна-аздараўленчая і турысцка-рэкрэацыйная дзейнасць» — 2,7 чалавека на месца, «Лагапедыя» — 2,4 чалавека на месца, «Пачатковая адукацыя», «Біялогія і хімія» — 2,2 чалавека на месца.

Самыя высокія прахадныя балы па дзённай форме навучання: 329 — на спецыяльнасці «Лагапедыя», 323 — на спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва і камп'ютарная графіка», 289 — на спецыяльнасцях «Сурдапедагогіка» і «Руская мова і літаратура. Замежная мова», 287 — на спецыяльнасці «Практычная псіхалогія», 288 — на спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва, чарчэнне і народныя мастацкія промыслы».

Па большасці спецыяльнасцяў дзённай і завочнай формаў навучання прахадныя балы выраслі ў параўнанні з 2015 годам. Так, на дзённай форме навучання на спецыяльнасці «Лагапедыя» прахадны бал вырас адразу на 50 пунктаў, на спецыяльнасці «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова» — на 49.

Увагі заслугоўвае і яшчэ адна цікавая тэндэнцыя: нягледзячы на тую акалічнасць, што прафесія настаўніка паступова пераўтвараецца ў жаночую, сёлета вырасла колькасць юнакоў, якія вырашылі звязаць сваю прафесійную будучыню менавіта з педагогікай. У прыватнасці, сярод тых, хто паступіў на факультэт прыродазнаўства, мужчыны складаюць 30% ад агульнай колькасці, на фізіка-матэматычным і гістарычным факультэтах мужчын больш як 40%, а на факультэце фізічнага выхавання — каля 60%.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Надвор'е

## СПЯКОТА!

**Заключны ліпеньскі тыдзень чакаецца па-сапраўднаму гарачым. Сярэдняя тэмпература перавысіць шматгадовыя значэнні для гэтага перыяду прыкладна на 4-6 градусаў. На поўдні краіны ртутны слупок будзе ледзь не штодня набліжацца да адзнакі ў 33 градусы. Аб гэтым паведамляе рэспубліканскі Белгідраметцэнтр.**

Сёння кароткачасовыя навальнічныя дажджы пройдуць пераважна на заходзе раёнах краіны. Тэмпература паветра будзе вагацца ад 17—22 градусаў уначы да 27—32 удзень. У сераду зона непрацяглых дажджоў распаўсюдзіцца ўжо на большую частку тэрыторыі. Спёка, аднак, адступіць толькі на 1-2 градусы. А вось у чацвер умовы надвор'я зноў стануць такімі ж, як і ў аўторак. Па папярэднім прагнозе, крыху пахаладае толькі напрыканцы тыдня, калі ў пятніцу да нас завітае актыўны франтальны падзел. Ён прынясе навальнічныя дажджы ў большасць раёнаў краіны. Але даставаць курткі з шафы ўсё ж нявартa: ноччу чакаецца ад 15 да 21 градуса цяпла, удзень паветра прагрэецца да плюс 22—29.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.** *schklennik@zviazda.by*